УДК 73/76 :7.038.6“19”
*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* mtsybulsky@rambler.ru – **М. Л. Цыбульскі**

# Паэтыка постмадэрнісцкай прасторы і асноўныя дыскурсы мастацтва гэтай эпохі

**Цыбульскі М. Л.**
*Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава”, Віцебск*

*Постмадэрнізм у апошняй трэці XX стагоддзя не проста ператварыўся ў эстэтычны феномен і філасофію мастацкага жыцця, але стаў своеасаблівым знакам зменаў свету, арыенціраў, сістэмы каштоўнасцей. У гэты гістарычны перыяд інтэртэкстуальнасць, маніпуляванне традыцыямі, плюралізм, прынцыповы эклектызм, фрагментарнасць, прынцып цытавання, імітацыі, эпатажу, гульні становяцца ў мастацтве асновай творчасці. Проціпастаўленне “глабальнага” і “лакальнага”, “цэнтра” і “перыферыі”, як і ўсякая іншая іерархія каштоўнасцей здымаюцца ў імя суіснавання розных культурных мадэляў.*

*Канцэптуальная катэгорыя дыскурсу ўяўляецца найбольш выразнай для вызначэння асаблівасцей постмадэрнісцкіх мастацкіх практык, паколькі постмадэрнісцкая парадыгма і постмадэрнісцкі дыскурс суіснуюць у дыялектычным двуадзінстве.*

*У артыкуле вызначаецца сутнасць паняцця “дыскурс” у кантэксце выяўленчага мастацтва. Пры аналізе дыскурсаў постмадэрнісцкага мастацтва разглядаюцца тры яго вымярэнні, тры зрэзы, тры ўзроўні класіфікацыі, уключаючы удзельнікаў камунікацыі, сітуацыю рэпрэзентацыі і самі творы мастацтва.*

***Ключавыя словы:*** *мастацтва XX стагоддзя, паэтыка, постмадэрнізм, парадыгма, дыскурс.*

# Poetics of Postmodernist Environment and Main Discourses of the Art of That Age

**Tsibulski M. L.**
*Educational establishment “Vitebsk State P. M. Masherov University”, Vitebsk*

*Postmodernism in the late XX century did not just convert into an aesthetic phenomenon and philosophy of artistic life but became a special feature of the transformation of the world, landmarks, values system. In that historical period intertextuality, manipulation of traditions, pluralism, eclectism, fragmentarity, quotation, imitation, showing off, game principles became basis of artistic work. Opposition of “the global” and “the local”, “the center” and “the periphery” like any other hierarchy of values is forgotten for the sake of coexistence of different cultural models.*

*The conceptual category of discourse is seen as most expressive to identify features of postmodernist artistic practices since postmodernist paradigm and postmodernist discourse coexist in dialectic dual unity.*

*The notion of discourse in the context of fine arts is identified in the article. During the analysis of the discourse of postmodernist art its three dimensions, three levels of classification are considered, including participants of communication, situation of representation as well as works by the artist themselves.*

***Key words:*** *XX century art, poetics, postmodernism, paradigm, discourse.*

Постмадэрнізм у апошняй трэці XX стагоддзя не проста ператварыўся ў эстэтычны феномен і філасофію мастацкага жыцця, але стаў своеасаблівым знакам зменаў свету, арыенціраў, сістэмы каштоўнасцей. У гэты гістарычны перыяд інтэртэкстуальнасць, усеагульная амбівалентнасць, маніпуляванне традыцыямі, радыкальны плюралізм, прынцыповы эклектызм, усёпаглынальная іронія, фрагментарнасць, прынцып цытавання, імітацыі, эпатажу, гульні становяцца ў мастацтве

Репозиторий ВГУ

асновай творчасці. Проціпастаўленне “глабальнага” і “лакальнага”, “цэнтра” і “перыферыі”, як і ўсякая іншая іерархія каштоўнасцей здымаюцца ў імя суіснавання розных культурных мадэляў .

Паступова постмадэрнізм становіцца татальным станам усёй культуры, ператвараецца ў парадыгму, якая спараджае ў мастацтве розныя толькі ёй уласцівыя з’явы.

“Адметнай прыкметай постмадэрнісцкай парадыгмы, з’яўляецца тое, што яна не мае ні агульных абрысаў, ні выразнага адмежавання ад папярэдніх парадыгмаў. Постмадэрнізм ёсць не толькі пераадоленне мадэрнізму, але і шмат у чым яго працяг. Постмадэрнісцкая тэхніка абнавіла мадэрнісцкую канцэпцыю. Назіраецца як шэраг адметных асаблівасцей, так і мноства агульных характарыстык. (...)” [1].

Адсутнасць веры ў ідэалы становіцца істотнай прыкметай постмадэрнізму, з’яўляецца пазіцыяй большасці творцаў. Пошук сутнасцей саступаюць месца пагоні за сенсацыяй, іроніі і парадыраванню рэальнасці. На ўнікальнасць і навізну не прэтэндуюць ні мастак, ні яго твор. (...) “Пад пытанне пастаўлена калісьці безумоўная каштоўнасць творчасці” [2].

Відавочна, што тэрмін “постмадэрнізм” характарызуе сабой не толькі асаблівасці твораў мастацтва, але кантэкст, драматургію ўзаемадачыненняў паміж мастаком, гледачом, аб’ектам мастацтва, прасторай і часам. Разважаючы пра постмадэрнізм, варта мець на ўвазе, што гаворка ідзе не проста пра асаблівасці стыляў, жанраў, а пра сутнасць і разнастайныя аспекты творчых паводзін. “Постмадэрнісцкая парадыгма і постмадэрнісцкі дыскурс суіснуюць у дыялектычным двуадзінстве” [1, с. 7].

Мэта дадзенага артыкула – прааналізаваць асноўныя рысы постмадэрнісцкай паэтыкі, камунікатыўныя асаблівасці мастацкіх практык і асноўныя дыскурсы мастацтва гэтай эпохі.

**Дыскурс і яго тэрміналагічная сутнасць**. У многіх еўрапейскіх мовах **слову дыскурс няма эквівалента**, яно перакладаецца як слова, тэкст, меркаванне… Этымалогія гэтага тэрміна ўзыходзіць да лацінскага “discurrere”, што азначае “абмяркоўваць”, “весці перамовы”, і менавіта ў такім значэнні ён актыўна выкарыстоўваўся ў навуцы XVI–XVIII стагоддзяў.

З пачатку XX ст. паняцце “discours” пачынае больш ці менш часта ўжывацца ў мастацкай і асабліва філасофскай літаратуры. Даволі актыўна гэты тэрмін выкарыстоўваецца ў дачыненні да лінгвістыкі і літаратуры ў пачатку 1950-х, а найбольш поўна – у 1970-я гады [3]. Велізарны ўнёсак у развіццё тэорый дыскурсу зрабілі М. Бахцін і Ю. Лотман. А дзякуючы працам французскага філосафа, тэарэтыка культуры і гісторыка Мішэля Фуко тэрмін набыў амаль што філасофскае гучанне [4]. Зыходзячы з канцэпцыі моўнага характару мыслення, М. Фуко казаў аб дыскурсіўным характары свядомасці чалавека, пісаў аб тым, што кожная навука мае свой дыскурс як “форму ведаў”, якая ўключае спецыфічны паняційны і тэрміналагічны апарат [5]. У другой палове XX стагоддзя дыскурс, акрамя таго, становіцца адной з ключавых катэгорый навуковага аналізу, прадметам адмысловых даследаванняў у галіне цэлага шэрагу дысцыплін.

Тым не менш і сёння паняцце дыскурсу выглядае даволі расплывіста. Нават націск у гэтым слове можа ставіцца двояка (на першым і на другім складзе). У акадэмічным кантэксце гэты тэрмін часцей за ўсё ўжываюць з націскам на другім складзе па лацінскім (ці французскім), а не ангельскім ўзоры.

Сёння ў лінгвістычнай тэорыі дыскурс – адно з цэнтральных паняццяў, якое мае два асноўныя значэнні: першае з іх азначае любыя формы маўленчага ўзаемадзеяння паміж людзьмі, другое – вобраз мыслення і тое, як ён выяўляецца славесна. У вузкім сэнсе дыскурс – гэта спецыфіка арганізацыі маўлення (паняцце, блізкае стылю). Даследаванне лінгвістычных асаблівасцей дыскурсу звычайна ўключае аналіз такіх моўных параметраў, як граматыка, лексіка, сінтаксіс.

У класічнай парадыгме пад дыскурсам разумеецца практыка мыслення, якая характарызуецца паслядоўнасцю, лагічнасцю і разгортваннем у паняццях і меркаваннях. Расплывісты характар паняцця, яго недакладная вызначанасць не перашкодзіў папулярнасці “дыскурсу”, лічыць прафесар Амстэрдамскага ўніверсітэта Тэун Ван Дэйк – аўтар велізарнай колькасці кніг і артыкулаў па пытаннях дыскурсу і дыскурс-аналізу, шматлікія з якіх ужо сталі класічнымі [6].

**Дыскурс у кантэксце выяўленчага мастацтва.** Звяртаючыся да дыскурсу, як шматзначнага тэрміна шэрагу гуманітарных навук, дакладнага і агульнапрынятага вызначэння якога не існуе, мы лічым неабходным пазначыць сваё ўяўленне пра дыскурс у кантэксце мастацтва выяўленчага. Так, дыскурсам мы будзем абазначаць працэс, камунікатыўную падзею, якая адбываецца паміж мастаком, і гледачом у вызначаным часавым і прасторавым кантэксце. Гэта не толькі сукупнасць мастацкіх практык, але і сам акт рэпрэзентацыі кантрэтных мастацкіх твораў і мастацкіх акцый сучасных творцаў, уключаючы пазіцыі і погляды асоб мастакоў, якія ў ёй удзельнічаюць. Дыскурс з’яўляецца

Рэпазіторый ВДУ

адначасова вынікам і сродкам канструявання рэальнасці мастацтва, і відавочна носіць дынамічны характар. Гэта заўжды актуальнае дзеянне, якое злучана з адпаведнай сітуацыяй, часам, з канкрэтным сацыякультурным кантэкстам.

Канцэптуальная катэгорыя дыскурсу ўяўляецца найбольш выразнай для вызначэння асаблівасцей постмадэрнісцкіх мастацкіх практык. Зыходзячы з вызначэння дыскурсіўнага і канструктыўнага характару постмадэрнізму, дадзенага Мак Хэйлам, мы паспрабуем вылучыць некаторыя асноўныя моманты постмадэрнісцкага дыскурсу ў прасторы мастацтва [7]. У дадзеным кантэксце дыскурс уяўляе сабой сістэму паняццяў і тэрмінаў, якія ў сукупнасці больш менш дакладна характарызуюць постмадэрнісцкае мастацтва. Макраструктура дыскурсу злучана з фундаментальнымі прынцыпамі постмадэрнізму, як канкрэтнага і вельмі своеасаблівага этапу развіцця мастацтва. Прынцыпова важна, што для постмадэрнізму дыскурс набыў асаблівы статус, абазначаючы той факт, што дадзены твор належыць посткласічнай прасторы.

**Дыскурсы постмадэрнісцкага мастацтва.** Аналізуючы дыскурсы постмадэрнісцкага мастацтва мы павінны ўлічваць тры яго вымярэнні, тры зрэзы, тры ўзроўні класіфікацыі, уключаючы удзельнікаў камунікацыі, сітуацыю рэпрэзентацыі і самі творы мастацтва.

Відавочна, што ўсе ўдзельнікі камунікацыі па-свойму ўплываюць на працэс фармавання дыскурсу. Мастак – як аўтар твора, не проста генерыруе нейкія сэнсы. Каб глядач змог зразумець сутнасць твора, мастак павінен арыентавацца і ўлічваць узровень ведаў гледача, у нейкай ступені прадбачыць і нават мадэляваць працэс успрыняцца. Нельга не адзначыць і ўяўнае адмаўленне мастака ад свайго традыцыйнага “я”, факт так званай “смерці аўтара” у постмадэрнісцкім мастацтве, растварэнне яго голасу ў выкарастаных дыскурсах. Творчасць шматлікіх мастакоў, якія належаць да постмадэрнізму, адрозніваецца канцэптуальнасцю і высокай ступенню тэарэтычнай рэфлексіі. Тое, што мастацтва постмадэрнізму проста не можа існаваць без аўтарскага каментара, безумоўна, спрыяе фармаванню дыскурсу. Практычна ўсе мастакі выступаюць як тэарэтыкі ўласнай творчасці. Мастак знаходзіцца “ў становішчы філосафа: тэкст, які ён піша, твор, які ён стварае, у прынцыпе не падпарадкоўваюцца загадзя ўсталяваным правілам, яму нельга выносіць прысуд, які не падлягае абскарджанню, ужываючы да яго агульнавядомыя крытэрыі адзнакі. Гэтыя правілы і катэгорыі і ёсць як раз тое, што шукае сам твор мастацтва” [8].

Мастацтва постмадэрнізму разлічана як на эрудыцыю, так і на забаўляльнасць і звернута да элітарнага і масавага гледача адначасова. Асноўнай жа задачай гледача з’яўляецца яго здольнасць успрыняць і інтэрпрэтаваць інфармацыю, якую ён атрымлівае пад час знаёмства з творам мастацтва. На гэты працэс аказваюць уплыў светапогляд і адукацыя гледача, яго сацыяльнае становішча, узрост і велізарная колькасць іншых фактараў. І, безумоўна, адкрытасць да дыялогу, як аснова камунікацыі.

Інтэртэкстуальнасць, як важная ўласцівасць посмадэрнісцкай паэтыкі, таксама ўплывае на дыскурсіўныя практыкі, вызначаючы іх нелінейны характар. Ніводны твор мастацтва ў постмадэрнісцкай прасторы не існуе ізалявана, ён падвяргаецца ўплыву з боку ўсёй мастацкай прасторы і, у сваю чаргу, сам уздзейнічае на яе. У кантэксце ўсяго постмадэрнісцкага светапогляду інтэртэкстуальнасць разглядаецца як адзіны механізм спараджэння тэкстаў і твораў мастацтва.

Уласцівыя пастмадэрнізму розныя тыпы свядомасці, мыслення, наяўнасць мноства сэнсаў і пунктаў гледжання на тую ці іншую праблему, прадвызначаюць і шматграннасць падыходаў да вызначэння форм дыскурсу. Постмадэрнізм спараджае новыя віды, жанры мастацтва, сцвярджае плюралізм культурных мадэляў, якія выкарыстоўваюцца як раўнапраўныя. Вялікая роля належыць дыскурсіўным гульням з мовай, вобразамі, стылямі і, канешне ж, гульням з чытачом. Постмадэрнізм практыкуе адкрыты рэтраспектывізм, адначасовы зварот да розных традыцыйных мастацкіх формаў; эклектызм, прыхільнасць ды цытатнага сумяшчэння несумяшчальнага. Адсюль зварот да прынцыпа фрагментарнасці, да выкарыстання калажа і мантажа. Іранізаванне і парадыраванне класічных узораў, пераацэньванне каштоўнасцей, карнавалізацыя і проста смех набываюць у дыкурсіўных практыках важнае месца.

Як у цэлым постмадэрнізм, так і ўласцівыя мастацтву гэтай эпохі дыскурсы насычаны гратэскнымі формамі, звычайна спецыфічнымі абсурдысцкімі [9]. Пры гэтым элементы абсурдызму не выклікаюць абурэння і даволі хутка становяцца культурнай нормай.

У паэтыцы постмадэрнізму змяняецца і тэмпаральнасць мастацкіх працэсаў, а ідэя дынамікі становіцца надзвычай важнай і прыходзіць на змену статыцы, характэрнай для класічнай культуры.

Постмадэрнізм паспрыяў фармаванню спецыфічных арт-практык, да ліку якіх у першую чаргу варта аднесці хэпенінг і перформанс. Бясфабульнае тэатралізаванае дзеянне, якое ўяўляе сабою



Рэпазіторый ВДУ

хэпенінг, развіваецца без загадзя запраграмаванага сцэнара і ўключае часам знарочыста абсурдныя, спантаныя, і неспадзяваныя паводзіны выканаўцаў. Ірацыянальнаму элементу ў хэпенінгу прыпісваецца адмысловая эстэтычная і псіхааналітычная значнасць. У адрозненні ад хэпенінгу, які разлічаны на актыўны ўдзел гледачоў, у перформансе цалкам дамінуе сам мастак, ці яго памочнікі – статысты, якія прадстаўляюць публіцы жывыя кампазіцыі з сімвалічнымі паставамі, жэстамі і атрыбутамі. Хэпенінг і перформанс адносяцца да так званага "постмадэрнісцкага акцыянізму", паколькі сродкам і матэрыялам творчасці ў іх служаць цела, жэсты, паводзіны мастака, які бярэ на сябе ролю акцёра.

**Масмедыя.** Адмысловую ролю ў фармаванні дыскурсаў і мовы постмадэрнізму, па прызнанні большасці тэарэтыкаў, адыгрываюць масмедыі – сродкі масавай інфармацыі. Сапраўды, у ХХ стагоддзі "на змену лінейнаму спосабу мыслення, які ўсталяваўся пасля вынаходства друкаванага станка, прыходзіць больш глабальнае ўспрыманне праз выявы тэлебачання і іншыя электронныя медыумы [10].

З усіх інфармацыйных масмедыйных тэхналогій, якія атрымалі бурнае развіццё ў апошнія дзесяцігоддзі ХХ стагоддзя, тэлебачанне, мабыць, найбольш ярка перадае атмасферу постмадэрнізму. З аднаго боку тэлебачанне выступае ў ролі мадэлі, якая інтэрпрэтуе рэальнасць постмадэрнізму, а з іншага – сама гэта мадэль можа быць інтэрпрэтавана з дапамогай сродкаў постмадэрнізму. Сапраўды, тэлебачанне ёсць стыль і вобраз эпохі постмадэрнізму, паколькі інтэртэкстуальнасць, мазаічнасць, калажнасць, серыйнасць, дыскрэтнасць з'яўляюцца неад'емнымі спосабамі канструявання тэлевізійнай прасторы. Глядач стварае свой уласны расклад праграм і разам з тым становіцца няздольным успрымаць доўгія думкі і разважанні, яго "кліпавая" свядомасць з'арыентавана на кароткія, але запамінальныя фрагменты інфармацыі, што, уласна, і нядзіўна, бо падобны падыход да ўспрымання з'яўляецца адной з рыс постмадэрнісцкага светаадчування.

Канец ХХ стагоддзя адзначыўся ўваходжаннем у жыццё людзей прынцыпова новага сродку масавай камунікацыі – глабальнай сеткі Internet. Бязмежныя магчымасці, імклівае распаўсюджванне гэтай найновай інфармацыйнай тэхналогіі паспрыялі яе актыўнаму выкарыстанню і ў мастацтве. Глабальная сетка вызначыла прастору кіберкультуры і стварыла ўмовы для фармавання розных відаў віртуальных супольнасцей. Значэнне гэтай формы дыскурсу няўхільна ўзрастае з кожным годам.

Але ж адмаўленне магчымасці існавання любой іерархіі сярод розных дыскурсаў мастацтва – ёсць не што іншае як сродак выражэння светапогляду і светаадчування чалавека канца ХХ стагоддзя. Магчымасць і свабода выкарыстання ўсяго арсеналу розных каналаў камунікацыі, безумоўна, спрыяюць і развіццю самога мастацтва.

**Заключэнне.** У дыскурсаў мастацтва постмадэрнізму ў кожнай краіне свой кантэкст і адметная канфігурацыя дыскурсіўнага поля. Аднак усіх іх яднае паэтыка постмадэрнізму з дакладна акрэсленымі рысамі і асаблівасцямі.

Ужо ў сярэдзіне 1990-х гадоў паўстала адчуванне вычарпанасці постмадэрнізму і пачалі прадказваць яго магчымы канец [11]. Даўно "абвешчана пра наступ эпохі after-postmodern-a, узнікненні пост-постмадэрнісцкай філасофіі і новай метафізікі – для ХХІ стагоддзя" [2, с. 3–19]. Калі не атаясамляць паняцці "постмадэрнізм" і "постмадэрнасць", як прапануе М. Эпштэйн, то можна зразумець, што постмадэрнізм – гэта першы перыяд эпохі постмадэрнасці, які азначае новую вялікую эпоху ў гісторыі сусветнай культуры [12]. А значыцца ў пазначанай вышэй камунікатыўнай прасторы ўсіх нас чакаюць новыя сустрэчы з мастацтвам і новыя дыялогі пра шляхі яго развіцця.

### ЛІТАРАТУРА


1. Роганова, И. С. Актуализация постмодернистской парадигмы в культуре конца ХХ века: автореф. … дис. д-ра культурологии: 24.00.01 / И. С. Роганова. – М., 2010. – С. 24.
2. Кутырев, В. А. Философия иного, или Небытийный смысл трансмодернизма / В. А. Кутырев // Вопросы философии. – 2005. – № 12. – С. 3–19.
3. Степанов, Ю. С. Альтернативный мир, Дискурс, Факт и принцип Причинности / Ю. С. Степанов // Язык и наука конца ХХ века: сб. ст. – М.: РГГУ, 1995. – С. 35–73.
4. Фуко, М. Порядок дискурса / М. Фуко // Воля к знанию: по ту сторону власти, знания и сексуальности. Работы разных лет / сост., пер. с фр., коммент. и посл. С. Табачниковой; под общ. ред. А. Пузырея. – М.: Касталь, 1996. – С. 47–96.
5. Ильин, И. Дискурс / И. Ильин // Западное литературоведение ХХ века: энциклопедия. – М.: INTRADA, 2004. – С. 138.


Рэпазіторый ВДУ

6. Teun Van Dijk. Ideology: A Multidisciplinary Approach / Teun Van Dijk. – London: Sage, 1998.
7. McHale, Brian. Postmodernist Fiction. London: Routledge, 1987. McHale, Brian. Constructing Postmodernism. – N. Y.: Routledge, 1992.
8. Lyotard, J.F. Answering question: What is post! Modernism / J.F. Lyotard // Innovation / Renovation: New per! spectives on the humanities / Ed. by I. Hassan, S. Hassan. – Madison: University of Wisconsin Press, 1983. – P. 340–341.
9. Юрков, С. Е. Постмодернизм: приближение к антимиру / С. Е. Юрков // Эстетика в интерпарадигмальном пространстве: перспективы нового века: материалы науч. конф., 10 окт. 2001 г. Сер. “Symposium”. – СПб.: Санкт-Петербургское философское общество, 2001. – Вып. 16. – С. 85–88.
10. Маршалл Маклюэн. Галактика Гутенберга. Становление человека печатающего = The Gutenberg Galaxy: The Making of Typographic Man / Маршалл Маклюэн. – 2-е изд. – М.: Академический проект, Гаудеамус, 2013. – 496 с.
11. Wallace Martin. The Ends of Theory / Wallace Martin // The Ends of Theory, ed. by J. Herron et al. Detroit, Wayne State University Press, 1996. – P. 14.
12. Эпштейн, М. Постмодерн в русской литературе / М. Эпштейн. – М., 2005. – С. 472–476.

*Паступіў у рэдакцыю 28.04.2015 г.*

Репозиторий ВГУ